§ 8-1

§ 8-2

§ 8-3

# § 8. Вырашэнне аграрнага пытання ў XIX — пачатку XX ст.

1. Каму належала зямля ў Беларусі ў пачатку XIX ст.?
2. Хто на ёй працаваў?
3. Якімі былі ўмовы карыстання зямлёй для сялян?

**Крызіс памешчыцкай гаспадаркі.** У канцы XVIII — першай палове XIX ст. на беларускіх землях паступова фарміраваліся новыя капіталістычныя адносіны, а прыгонная сістэма гаспадарання перажывала крызіс. Дамінуючым сектарам эканомікі з'яўлялася сельская гаспадарка, але яе развіццё тармазілася перажыткамі, якія ўсё яшчэ захоўваліся: буйны́м памешчыцкім землеўладаннем, малазямеллем сялян, непрадукцыйнай працай прыгонных сялян. Да 1861 г. у руках памешчыкаў заставалася да 40 % усёй зямлі, працягвалі існаваць буйныя магнацкія латыфундыі. Так, ва ўласнасці Радзівілаў, Вітгенштэйнаў і іншых магнатаў знаходзіліся сотні тысяч дзесяцін зямлі і дзясяткі тысяч прыгонных сялян.

Капіталізм праяўляўся ў росце таварнасці сельскай гаспадаркі, развіцці ўнутранага і знешняга рынку. Асобныя памешчыкі ў сваіх маёнтках пачалі ўкараняць прагрэсіўныя метады вядзення сельскай гаспадаркі. З-за мяжы запрашаліся аграномы, выпісваліся сельскагаспадарчая тэхніка, сартавое збожжа і пародзістая буйная рагатая жывёла. Памешчыкі сталі выкарыстоўваць працу наёмных рабочых. Пасевы збожжавых замяняліся тэхнічнымі культурамі (бульба, буракі, лён).

Пачынаючы з першай трэці XIX ст. бульба ў Беларусі заняла адно з найбольш важных месцаў сярод сельскагаспадарчых культур. Як тэхнічная сыравіна для вінакурства яна прыносіла вялікія даходы памешчыкам. Дзесяціна, засаджаная бульбай, пры перапрацоўцы ўраджаю з яе на спірт давала прыкладна ў 4 разы больш даходу, чым тая ж дзесяціна, засеяная жытам. Што датычыцца сялян, то для іх бульба стала літаральна «другім хлебам», неаднойчы ратуючы іх ад галоднай смерці ў неўраджайныя гады.



Ацалелы будынак вінакурнага завода Яўгена і Аляксандра Любанскіх у Лошыцкім парку



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Збор нядоімак. 1870 г.
Мастак *В. Пукіраў*

У Беларусі развіваліся вытворчасць цукровых буракоў і мяса-малочная жывёлагадоўля. Значная ўвага стала надавацца авечкагадоўлі. Воўна пастаўлялася на мясцовыя суконныя фабрыкі, а таксама вывозілася ў Польшчу.

Павялічваўся продаж сельскагаспадарчых прадуктаў у прамысловыя губерні Расіі і за мяжу. Гэтаму садзейнічала разгалінаваная рачная сістэма. У асноўным прадаваліся жыта, ячмень, авёс, гарох, бульба.

Але, нягледзячы на прыведзеныя прыклады, большасць памешчыкаў захоўвалі традыцыйныя спосабы вядзення гаспадаркі, імкнуліся павялічыць свае даходы за кошт узмацнення эксплуатацыі сялян. Найбольш распаўсюджанай формай павіннасці заставалася паншчына.

У сярэдзіне XIX ст. як на памешчыцкіх, так і на сялянскіх палях назіралася зніжэнне ўраджайнасці. Агратэхнічны ўзровень сялянскага земляробства ва ўмовах панавання паншчыннай гаспадаркі быў нізкім. Ураджайнасць на сялянскіх землях складала «сам-два» — «сам-тры».

«Сам» — старая і даволі дакладная сялянская ацэнка ўраджайнасці сельскагаспадарчых культур. У колькі разоў сабраў больш, чым пасеяў, такі і «сам». Напрыклад, для бульбы сярэднемінімальны ўраджай — «сам-шэсць»: вядро пасадзіў — шэсць вядзёр выкапаў. Ураджай, вышэйшы за гэтую норму, лічыцца добрым, ніжэйшы за «сам-шэсць» — лічыцца, што бульба не ўрадзіла.

У першай палове XIX ст. эканамічнае становішча сялянскіх гаспадарак пагоршылася. Адсутнасць асабістай свабоды і саслоўная няроўнасць рэзка абмяжоўвалі эканамічныя магчымасці селяніна. Звычайнай з'явай былі неўраджаі. Галеча, голад літаральна праследавалі многія гаспадаркі. Нядоімкі сялян у беларускіх губернях узраслі ў 1,5–2 разы. Нядоімкі падлягалі абавязковаму спагнанню.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

*Растлумачце прычынна-выніковую сувязь паміж занядпадам сялянскай гаспадаркі крызісам памешчыцкай гаспадаркі.*

*Складзіце схему «Прыкметы крызісу ў сельскай гаспадарцы Беларусі ў першай палове XIX ст.».*

Заняпад сялянскай гаспадаркі абумовіў крызіс памешчыцкай. Пра крызіс такой сістэмы гаспадарання сведчылі рост запазычанасці памешчыкаў, павелічэнне колькасці закладзеных маёнткаў, прададзеных з публічных таргоў за нявыплату даўгоў.

Пацвярджэннем крызісу феадальна-прыгоннай сістэмы стала таксама нарастанне сялянскага руху. Барацьба сялян прымала розныя формы: скаргі, адмова ад выканання павіннасцей, уцёкі, супраціўленне паліцыі і войскам, нават забойства памешчыкаў і іх служачых.

**Рэформы дзяржаўнай і памешчыцкай вёскі ў другой чвэрці XIX ст.** Дзяржава імкнулася захаваць існуючыя прыгонніцкія парадкі. Аднак узрастанне колькасці сялянскіх хваляванняў прымусіла ўрад пайсці на шэраг саступак. Мэтай рэформ у аграрным сектары было імкненне ўлад захаваць сістэму феадальнага землеўладання, узняць прыбытковасць дзяржаўнай і памешчыцкай вёскі.

Кіраваў распрацоўкай рэформ граф П. Д. Кісялёў — кіраўнік Міністэрства дзяржаўных маёмасцей, прыхільнік абмежавання прыгоннага права.

**Рэформы ў дзяржаўнай і памешчыцкай вёсках у другой чвэрці XIX ст.**

| Назва рэформы | Асноўныя мерапрыемствы рэформы |
|---|---|
| Рэформа ў дзяржаўнай вёсцы 1840–1857 гг. | • правядзенне «люстрацыі» (перапісу) дзяржаўнай маёмасці;<br>• вызначэнне памераў павіннасцей дзяржаўных сялян;<br>• спыненне здачы дзяржаўных сялян у арэнду; абмежаванне правоў арандатараў дзяржаўных маёнткаў (не маглі судзіць сялян, павышаць павіннасці);<br>• ліквідацыя фальваркаў;<br>• паступовы перавод сялян на грашовы аброк (чынш), надзяленне зямлёй і жывёлай; увядзенне палітыкі «апякунства» ў дачыненні да саміх сялян |
| Інвентарная рэформа ў памешчыцкай вёсцы 1844–1857 гг. | • увядзенне абавязковых інвентароў — дакументаў, якія ўключалі апісанне памераў сялянскіх надзелаў і павіннасцей;<br>• стварэнне дваранскіх інвентарных камітэтаў |


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

У адрозненне ад дзяржаўных сялян, пераведзеных на грашовы аброк, памешчыцкія сяляне працягвалі выконваць многія ранейшыя павіннасці: паншчыну, згоны, рамонт дарог і мастоў, плацілі даніну. Нягледзячы на некаторае пляпшэнне становішча сялянства, сельская гаспадарка заставалася ў крызісе з-за захавання прыгоннага права.



Чытанне Палажэння 19 лютага 1861 г. Мастак *Р. Мясаедаў*

**Асаблівасці і вынікі ажыццяўлення аграрнай рэформы 1861 г. у беларускіх губернях.** Адмена прыгоннага права ў 1861 г. была праведзена ў інтарэсах дзяржавы з улікам інтарэсаў памешчыкаў.

Рэформа 19 лютага 1861 г. прадугледжвала прадастаўленне сялянам асабістай свабоды і права выкупіць зямельны надзел. Памеры зямельных надзелаў для выкупу ўстанаўліваліся для кожнай мясцовасці.

Адмена прыгоннага права ў беларускіх губернях вызначалася двума «Мясцовымі палажэннямі».

Адно палажэнне дзейнічала для Магілёўскай губерні і васьмі паветаў Віцебскай, дзе было шырока распаўсюджана абшчыннае землекарыстанне, пры якім зямля належыць усёй абшчыне, а асобныя яе члены мелі права толькі на карыстанне зямлёй. Пры складанні статутных грамат (спецыяльных дакументаў, якімі рэгуляваліся пазямельныя адносіны паміж памешчыкамі і сялянамі) устанаўліваліся вышэйшыя і ніжэйшыя нормы зямельных надзелаў. Яны вагаліся ад 4—5,5 да 1—2 дзесяцін на душу мужчынскага полу (дзесяціна — 1,09 га). Аднак калі ў селяніна да рэформы зямлі было больш, чым прадугледжвалася вышэйшай нормай, то маглі быць зроблены «адрэзкі» ад сялянскіх надзелаў на карысць памешчыкаў. Апошнія пры падзеле зямлі звычайна выбіралі сабе самую ўрадлівую, што прывяло да цераспалосіцы (змешвання, чаргавання) панскіх і сялянскіх надзелаў. Цераспалосіца стрымлівала ўвядзенне рацыянальнай сістэмы земляробства, перашкаджала інтэнсіфікацыі сельскай гаспадаркі.

Другое палажэнне дзейнічала для Віленскай, Гродзенскай, Ковенскай, Мінскай губерняў і часткі Віцебскай, дзе існавала падворнае землекарыстанне сялян. Зямля была замацавана за кожным дваром, а не за абшчынай, як гэта было на ўсходзе Беларусі. У гэтых губернях «адрэзкі» дапускаліся ў тых выпадках, калі ў памешчыка заставалася менш за 1/3 ад усёй зямлі, сялянскі надзел не дазвалялася змяншаць больш чым на 1/6 частку.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Правілы выкупу надзелаў сялянамі былі аднолькавымі для ўсіх губерняў Расійскай імперыі. Памер выкупной сумы вызначаўся такім чынам, каб памешчык, паклаўшы яе ў банк пад 6 % гадавых, мог атрымліваць штогод прыбытак, роўны гадавому чыншу, які ён меў да правядзення рэформы. 20 % выкупной сумы сяляне павінны былі заплаціць самі непасрэдна памешчыку. Прыкладна 80 % кошту сялянскага зямельнага надзела памешчыкі атрымлівалі ад дзяржавы. У выніку такой аперацыі сяляне станавіліся даўжнікамі дзяржавы і абавязаны былі на працягу 49 гадоў не толькі вярнуць свой доўг ураду, але і выплачваць яшчэ штогод 6 %. Да выкупу зямельнага надзела селянін лічыўся часоваабавязаным, плаціў аброк і адпрацоўваў паншчыну.

Рэалізацыя аграрнай рэформы 1861 г. у беларускіх губернях праходзіла ва ўмовах нарастаючага сялянскага руху і паўстання 1863—1864 гг. Урад вымушаны быў пайсці на шэраг мерапрыемстваў, якія ўнеслі істотныя змены ў «Мясцовыя палажэнні 19 лютага 1861 г.», прынятыя для беларускіх губерняў.

Так, з мая 1863 г. на абавязковы выкуп зямельных надзелаў пераводзіліся сяляне Мінскай, Віленскай і Гродзенскай губерняў, а са студзеня 1864 г. — Віцебскай і Магілёўскай губерняў. У астатніх губернях еўрапейскай Расіі абавязковы выкуп надзелаў уводзіўся толькі з 1881 г. Указам ад 1 сакавіка 1863 г. назначалася праверка павіннасцей, прызначаных сялянам па статутных граматах. З гэтага часу яны пераводзіліся ў разрад сялян-уласнікаў і павінны былі ўносіць выкупныя плацяжы за зямлю, зніжаныя на 20 %. Сяляне, якія знаходзіліся на паншчыне, пераводзіліся на абавязковы аброк, які таксама быў зніжаны на 20 %.

*Ацаніце значэнне ўказаных мерапрыемстваў, праведзеных урадам у беларускіх губернях. Ці можна лічыць іх саступкамі на карысць сялян?*

Аднак і пасля некаторых урадавых саступак становішча сялян усё яшчэ было вельмі цяжкім. Вялікай праблемай заставаўся недахоп зямлі — так званае малазямелле. Сярэдні памер сялянскіх надзелаў у беларускіх губернях вагаўся ад 8 да 12 дзесяцін на двор. Пры існуючай у той час культуры земляробства такі надзел не мог забяспечыць селяніну даход, дастатковы для ўтрымання сям'і з 6—7 чалавек, выплаты выкупных плацяжоў, дзяржаўных падаткаў і іншых збораў.

Рэформа 1861 г., праведзеная ў інтарэсах памешчыкаў, абумовіла **«прускі» шлях развіцця капіталізму** ў сельскай гаспадарцы. Для яго былі характэрныя захаванне памешчыцкага землеўладання, малазямелле сялян, адпрацоўчая сістэма гаспадарання (памешчыцкія землі апрацоўваліся рыштункам сялян, якія атрымлівалі за гэта ад памешчыка зямельныя ўгоддзі ў арэнду). Захаванне прыгонных перажыткаў пагаршала становішча сялян і абумовіла іх далейшую барацьбу за зямлю.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

| Наступствы аграрнай рэформы 1861 г. | |
|---|---|
| **Перажыткі феадальных адносін** | **Рысы капіталістычных адносін** |
| • захавалася адпрацоўчая сістэма гаспадарання;<br>• захавалася буйное памешчыцкае землеўладанне;<br>• выкупныя плацяжы;<br>• цераспалосіца;<br>• адсутнічалі сучасныя тэхналогіі апрацоўкі зямлі | • сяляне атрымалі грамадзянскія правы;<br>• павялічылася выкарыстанне вольнанаёмнай працы;<br>• адбыўся пераход да таварнай сельскай гаспадаркі;<br>• пачалося маёмаснае расслаенне сялянства;<br>• мела месца спецыялізацыя сельскай гаспадаркі |

*Ці змагла рэформа 1861 г. вырашыць аграрнае пытанне? Чаму ў пачатку XX ст. у беларускай вёсцы захоўваліся феадальныя перажыткі? Якімі шляхамі можна было вырашыць аграрнае пытанне?*

**Асаблівасці і вынікі ажыццяўлення сталыпінскіх рэформ у беларускіх губернях.** Сялянскія выступленні ў гады першай рэвалюцыі (1905—1907 гг.) паказалі расійскаму ўраду, што сялянства не з'яўляецца цвёрдай апорай дзяржавы. З мэтай умацавання сацыяльнай базы ўлад і вырашэння **аграрнага пытання** ў пачатку XX ст. пачалося правядзенне новых рэформ. Было прынята рашэнне ліквідаваць сельскую абшчыну, расчысціць дарогу сялянскаму прадпрымальніцтву, узбагаціць адных сялян за кошт іншых, аблегчыць пераход маленькіх надзелаў беднякоў ва ўласнасць заможных аднавяскоўцаў. Тым самым урад планаваў стварыць у вёсцы новую сацыяльную апору дзяржаўнай улады ў асобе «моцных гаспадароў». Рэалізацыю гэтай палітыкі ажыццяўляў прэм'ер-міністр П. А. Сталыпін.

*Як вы думаеце, што меў на ўвазе П. А. Сталыпін, калі гаварыў, што «ўрад, правёўшы закон 9 лістапада 1906 г., рабіў стаўку на разумных і моцных»?*

9 лістапада 1906 г. пачалося ажыццяўленне чарговай аграрнай рэформы. Быў выдадзены ўказ аб парадку выхаду сялян з абшчыны і замацаванні ў прыватную ўласнасць зямлі ў выглядзе водруба (зямельнага ўчастка, выдзеленага з абшчыннай зямлі ва ўласнасць селяніна) альбо хутара

*Абмяркуйце, у чым заключаліся сацыяльныя і эканамічныя прычыны сталыпінскай аграрнай рэформы.*

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

(асобнага зямельнага ўчастка з домам, сядзібай уладальніка). Паколькі зямлі не хапала, праводзілася перасяленне сялян у Сібір на неасвоеныя землі.

Адной з асаблівасцей ажыццяўлення сталыпінскай рэформы на беларускіх землях было тое, што яна праводзілася толькі ў Магілёўскай і Віцебскай губернях, дзе да гэтага захоўвалася абшчыннае землекарыстанне. У Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губернях існавала падворная форма землекарыстання. Правядзенне сталыпінскай аграрнай рэформы было прыпынена ў гады Першай сусветнай вайны.

«Сталыпінскі вагон» названы па імені П. А. Сталыпіна (1862–1911), міністра ўнутраных спраў і старшыні Савета Міністраў. Першапачаткова быў створаны для перавозкі сялян-перасяленцаў у час аграрнай рэформы (1906–1911).



«Сталыпінскі вагон»

Яшчэ адной асаблівасцю сталыпінскай рэформы ў Беларусі стала ўвядзенне ў 1911 г. у Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях земстваў — выбарных органаў мясцовага самакіравання. У заходніх губернях (Гродзенскай, Віленскай, Ковенскай) земствы не ўводзіліся з прычыны значнай перавагі сярод іх выбаршчыкаў каталікоў, якіх адносілі да палякаў і якім царскі ўрад не давяраў пасля паўстання 1863—1864 гг.

Сталыпінская аграрная рэформа стварала магчымасці для **«амерыканскага» шляху развіцця капіталізму** ў сельскай гаспадарцы: укараненне машын, выкарыстанне перадавых спосабаў агратэхнікі і аграхіміі, стварэнне хутарскіх (фермерскіх) гаспадарак, замацавання зямлі за непасрэдным вытворцам-фермерам, свабодных продажу і куплі зямлі, распаўсюджвання арэнды, выкарыстання наёмнай працы.

Разам з тым па-ранейшаму захоўвалася памешчыцкае землеўладанне — адзін з асноўных перажыткаў феадалізму.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

| Аграрная рэформа П. А. Сталыпіна | | |
|---|---|---|
| **Мэты** | **Кірункі** | **Вынікі** |
| **Эканамічныя:**<br>• вырашыць праблему малазямелля сялян;<br>• пераадолець адсталасць вёскі – ліквідаваць прыгонныя перажыткі<br>**Палітычныя:**<br>• зняцце сацыяльнай напружанасці ў краіне;<br>• стварэнне сацыяльнай апоры самадзяржаўя – сялян-уласнікаў, фермераў;<br>• ураўнаванне сялян з іншымі саслоўямі | • разбурэнне сельскай абшчыны;<br>• адмена выкупных плацяжоў;<br>• ліквідацыя цераспалосіцы, стварэнне хутароў і водрубаў;<br>• стварэнне Сялянскага зямельнага банка для куплі казённых альбо дваранскіх зямель;<br>• перасяленне сялян з цэнтра на ўскраіны (Сібір, Сярэдняя Азія, Каўказ, Далёкі Усход);<br>• аказанне дзяржаўнай дапамогі сялянскім гаспадаркам | • распад абшчыны ў вёсцы, пашырэнне сялянскага землеўладання, маёмаснае расслаенне;<br>• павышэнне агратэхнічнай культуры сялян;<br>• захаванне памешчыцкага землеўладання |

*Абмяркуйце, у чым заключаліся плюсы і мінусы сталыпінскай аграрнай рэформы.*

**1.** Сфармулюйце, у чым заключалася аграрнае пытанне ў Расіі ў XIX — пачатку XX ст. Якія падпытанні (кампаненты) можна ў ім вылучыць?
**2.** У чым праяўляўся крызіс у сельскай гаспадарцы ў першай палове XIX ст.?
**3.** Складзіце табліцу «Рэформы ў дзяржаўнай і памешчыцкай вёсцы ў XIX ст.». Зрабіце вывад аб іх выніковасці.

| Параметры параўнання | Рэформа ў дзяржаўнай вёсцы | Інвентарная рэформа | Аграрная рэформа 1861 г. |
|---|---|---|---|
| Мэта | | | |
| Змест | | | |
| Вынікі | | | |

**4.** Ахарактарызуйце асноўныя кірункі сталыпінскай аграрнай рэформы. Дакажыце, што сталыпінская рэформа садзейнічала развіццю капіталістычнай сістэмы гаспадарання.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**5.** З чым, па вашым меркаванні, былі звязаны рэформы ў аграрнай сферы на працягу XIX — пачатку XX ст.? Якія агульныя мэты яны пераследавалі? Ці былі гэтыя мэты дасягнуты?

§ 9

## § 9. Развіццё капіталістычных адносін у прамысловасці ў XIX — пачатку XX ст.

Што такое прамысловая рэвалюцыя, якімі былі яе прычыны і наступствы ў Заходняй Еўропе?

**Асаблівасці прамысловай рэвалюцыі ў Беларусі.** Пераход да капіталістычнага спосабу вытворчасці ў прамысловасці праяўляўся ў яе паступовай **мадэрнізацыі** — увядзенні ўдасканаленняў, якія адпавядалі б тэхнічным патрабаванням XIX ст. Мадэрнізацыя прамысловасці ў гэты перыяд характарызавалася пашырэннем індустрыялізацыі — пераходу ад ручной працы да машыннай, да фарміравання прамысловай буржуазіі і вольнанаёмнага рабочага класа. Гэты працэс атрымаў назву прамысловага перавароту, альбо прамысловай рэвалюцыі.

Характэрнай рысай прамысловага развіцця Беларусі ў другой палове XIX ст. было тое, што разам з адносна хуткім ростам фабрычнай індустрыі ў беларускіх губернях дамінавалі дробныя рамесныя прадпрыемствы і мануфактуры.

Рамесныя прадпрыемствы грунтаваліся на ручной працы. Перш за ўсё гэта былі промыслы па перапрацоўцы мясцовай сыравіны: дрэва (сталярныя), гліны (ганчарныя), скуры (кушнерскія, шавецкія), воўны і льну (ткацкія). Рамесная вытворчасць канцэнтравалася ў гарадах і шматлікіх мястэчках. Да канца XIX ст. адзначалася павелічэнне колькасці дробных рамесных прадпрыемстваў, узрос аб'ём іх прадукцыі. У канцы 1890-х гг. ён складаў 37,8 % ад усёй прамысловай прадукцыі Беларусі.

Пасля рэформы 1861 г. паскорыўся рост мануфактурнай вытворчасці. Тут выкарыстоўвалася ручная праца, але існавала яе раздзяленне па спецыяльнасцях. Мануфактуры ўзнікалі з сялянскіх промыслаў і гарадскога рамяства. У канцы XIX ст. мануфактуры пераважалі ў кушнерскай, ганчарнай, цаглянай, суконнай, шкляной і тытунёвай вытворчасці і давалі 15,4 % валавой прамысловай прадукцыі Беларусі.

У другой палове XIX ст. у прамысловасці Беларусі ішоў працэс пераходу ад ручной працы да машыннай. Рамяство і мануфактуру паступова выціскала капіталістычная фабрыка.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ